**RESUME**
**THE INDUSTRIAL ARCHITECTURE HERITAGE IN BELARUS AND ITS HISTORY AND CULTURE SIGNIFICANCE**

The industrial architecture in Belarus at 19th – beginning of the 20th century is not well known as compared with other parts of architecture. The article describes the method of heritage evaluation for the industrial architecture in Belarus at 19th – beginning of the 20th century. In proposed method considered the architecture peculiarities of the industrial buildings in Belarus. The appraisal of cultural, historic, scientific and artistic characteristics of old industrial building postulate acknowledgment it as the memorial. The architecture of industrial buildings is an integral part of material culture, a common cultural heritage of Belarus.

УДК 726.5 (476)
***Віраб'ёў В.Г., аспірант БНТУ, г. Мінск***

## ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ПРАВАСЛАЎНАЙ АРХІТЭКТУРЫ ПРЫБУЖЖА

Даследаванне праваслаўных храмаў канца 20, пачатку 21 ст. паказвае самабытны архітэктурны шлях Прыбужжа, які спалучыў у сабе розныя архітэктурныя канцэпцыі: развіццё традыцыйных падыходаў і спробы сучаснага мастацка-вобразнага асэнсавання будынка храма, але ў абодвух напрамках адлюстроўваецца цесная сувязь з мясцовай архітэктурнай традыцыяй культавай архітэктуры. У пэўнай ступені гэта можна тлумачыць тым, што рэгіён пазбег найвялікшых ганенняў на царкву, якія адбываліся ў першай палове 20 ст. ва ўсходняй Беларусі, у выніку чаго цалкам вынішчылася традыцыйнае ўсведамленне храма, як асноўнага кампазіцыйнага элемента горада і вёскі.

Большасць праваслаўных цэркваў у Прыбужскім рэгіёне размяшчаецца ў грамадскім цэнтры селішча, на галоўнай вуліцы, прычым дадзены прынцып пасадкі праваслаўных аб'ектаў у поўнай ступені характэрны, як для старадаўніх, так і для сучасных пабудоў. Як прыклад можна прывесці Свята-Ганнінскі храм (Ілюстрацыя 1), які цяпер будуецца ў вёсцы Матыкалы, Брэсцкага раёну і знаходзіцца ў грамадскім цэнтры, побач з прадпрыемствамі гандлю, адміністратыўнымі пабудовамі, школай і поштай. Дамінантнае месца царквы дапамагае стварыць сістэму візуальных арыентыраў, мастацка-каштоўную забудову плошчаў і вуліц, непаўторныя перспектыўныя віды, узбагаціць сілуэт горада адмысловым абрысам купалоў. Добрай ілюстрацыяй можа служыць Брэсцкі Свята-Уваскрасенскі сабор, пабудаваны ў 2001 г. (Ілюстрацыя 2), які не толькі ўзбагачае "кубічную" архітэктуру сучаснага мікраараёна сваімі закругленымі формамі, але дзякуючы вялікім памерам "чытаецца" нават з супрацьлег-лага боку ракі Мухавец, дапамагая зарыентавацца ў прасторы горада. Непаўторны сілуэт стварае Свята-Георгіеўская царква (Ілюстрацыя 3), якая знаходзіцца на беразе сажалкі і узвышаецца над адна- і двухпавярховымі катэджамі вёскі Вычулкі (цяпер уваходзіць у склад горада Брэста) пабудаваная ў 2003 г.



***Ілюстрацыя 1. в. Матыкалы, Свята-Ганнінскі храм***



***Ілюстрацыя 2. г. Брэст, Свята-Васкрасенскі сабор***



***Ілюстрацыя 3. в. Вычулкі, Свята-Георгіеўскі храм***

Аб'ёмна-прасторавая пабудова сучасных храмаў прадаўжае старадаўнія традыцыя і ўвасабляецца ў двух асноўных кампазіцыйных канцэпцыях, цэнтрычнай і прадольна-восевай. Варта адзначыць, што сучасныя архітэктары пачалі значна часцей карыстацца канцэпцыяй пабудовы кампазіцыі храма па вертыкальнай восі. Цікавай рысай часткі новых храмаў з'яўляецца размяшчэнне дадатковых купалоў па баках свету, а не па дыяганалях храма, прыём уласцівы беларускай архітэктурнай школе [1, с.115] (Свята-Ганнінская царква, вёска Матыкалы). Важнай асаблівасцю кампазіцыі пабудоў дадзенага тыпу з'яўляецца ўвядзенне ва ўжытак цыліндрычных і шматгранных аб'ёмаў (Свята-Уваскрасенскі сабор і храм у гонар абраза Божай Маці "Усіх Смуткуючых Радасць" у Брэсце). Заслугоўвае ўвагі арыгінальнае перакрыццё цэнтральнай часткі Свята-Іаана-Багаслоўскага храма ў вёсцы Прыбарава ўзведзены ў 2004 г. (Ілюстрацыя 4), якое мае "ламаную" форму пакрыцця і трохвугольныя вітражы. Асаблівасцю сучасных храмаў з цэнтрычнай кампазіцыяй з'яўляецца вертыкальна развітыя аконныя праёмы і элементы дэкору, якія падкрэсліваюць развіццё кампазіцыі храма ў вышыню.



*Ілюстрацыя 4. в. Прыбарава, Свята-Іаана-Багаслоўскі храм*

Ня гледзячы на распаўсюджанне цэнтрычнай кампазіцыі, асноўная частка новых храмаў мае прадольна-восеваю пабудову. Бажніцы дадзенага тыпу ў большасці рэалізуюць традыцыйныя аб'ёмна-прасторавыя рашэнні, прасачыць гэта можна на прыкладзе Свята-Міхайлаўскай царквы вёскі Новая Расна, Камянецкага р-на (1991-97 гг.) [2], якая паўтарае кампазіцыйную пабудову Свята-Сямёнаўскага храма г. Камянец (1914 г.) [3, с.190].

Пэўныя змены адбыліся ў канструктыўных рашэннях сучасных храмаў, у выніку чаго з'явіліся новыя архітэктурныя прыёмы і падыходы. Праілюстраваць гэту тэндэнцыю можна паўсферычным скляпеннем Свята-Уваскрасенскага сабору, якое аб'ядноўваецца са скляпеннямі апсіды, бакавых прыдзелаў і бабінцу. Асаблівасцю Прыбужскага храмабудаўніцтва з'яўляецца выкарыстоўванне металічных канструкцый пры стварэнні паўсферычных пакрыццяў (храм у вёсцы Матыкалы), да прыкладу, на міншчыне, асноўная частка навапабудаваных храмаў мае маналітныя канструкцыі купалоў. Не вельмі дарэчным ужываннем сучасных матэрыялаў характырызуецца асноўны аб'ём храма ў гонар абраза Божай Маці "Ціхвінцкі" ў Брэсце, які ўяўляе сабой арачную канструкцыю з клеянай драўніны і нагадвае спартыўны, альбо складскі корпус. На сённяшні дзень вядуцца працы па надбудове кілепадобных аб'ёмаў, якія павінны ўзбагаціць бакавыя фасады і мінімізаваць недарэчныя асацыяцыі.

Дэкаратыўнае аздабленне фасадаў сучасных храмаў ўвабрала ў сябе вопыт асноўных стылявых плыняў мінуўшчыны, у трансфармаваным выглядзе мы сустракаемся са знаёмымі элементамі ў Свята-Іаана-Багаслоўскім храме вёскі Чэрні (1997 г.), што ў пэўнай ступені можна тлумачыць фальклёрнымі каранямі вобраза (архітэктурная імправізацыя падчас будаўніцтва). У дзейнасці прафесійных архітэктараў мы бачым стварэнне сваёй канцэпцыі дэкаратыўнага афармлення храма, прычым кожны архітэктар рашае гэтаю задачу па-свойму. Да прыкладу можна прывесці храм ў вёсцы Вычулкі, дзе пластычнае рашэнне фасадаў складаецца са ступенчатай плоскасці сцяны, вертыкальных чляненняў, кансольна выступаючых кілепадобных арак, хваляпадобных матываў на барабанах. Уся разнастайнасць форм узмацняецца ўжываннем розных колераў у залежнасці ад плоскасці сцяны. Больш стрыманым з'яўляецца дэкаратыўнае рашэнне царквы ў вёсцы Прыбарава, дамінуючымі элементамі якога з'яўляюцца гарызантальныя гзымсы, пояскі, абрамленне ўваходнага парталу, якія выкананы ў лекальнай цэгле.

Тэндэнцыя сучаснай прыбужскай архітэктуры, будаўніцтва выключна мураваных храмаў, вынятак складаюць толькі часовыя пабудовы, такія як: Храм у гонар вялікапакутніка Ваніфацыя і Свята-Праабражэнская царква ў Брэсце.

Грунтуючыся на даследаваным і праанalізаваным матэрыяле можна канстатаваць факт развіцця самабытнай праваслаўнай архітэктуры Прыбужжа, якая ўвабрала ў сябе найлепшы вопыт мінулага. У першую чаргу гэта тычыцца горадабудаўнічых традыцый, пры якім праваслаўныя пабудовы займаюць дамінуючае становішча ў структуры селішча. Адмысловымі рысамі прыбужскага храма з'яўляюцца: яго аднаапсіднасць, уласцівая амаль ўсім храмам рэгіёну; прыярытэт вертыкальна развітых цыбулепадобных завяршэнняў; актыўнае выкарыстоўванне блакітнага колеру, які мае вялікая колькасць старых храмаў і фрагментарна ўжываецца пры новым будаўніцтве.

Асаблівай ўвагі заслугоўвае аб'ёмна-прасторавая кампазыцыя Брэсцкага Свята-Уваскрасенскага сабора, храма ў гонар абраза Божай Маці "Усіх Смуткуючых Радасць", Свята-Ганнінскай царквы ў вёсцы Матыкалы і Свята-Іаана-Багаслоўскага храма ў вёсцы Прыбарава, якія не толькі ўвасобілі ў сабе наватарскія рашэнні, але ў пэўнай ступені рэалізавалі прынцыпы беларускай архітэктурнай традыцыі.

Не магла не сказацца адсутнасць вопыту праектавання аб'ектаў дадзенай тыпалогіі ў сённяшніх умовах, якая стала прычынай недасканалых рашэнняў. Да прыкладу можна прывесці перакрыцці Свята-Уваскрасенскага сабору ў Брэсце, якія выглядаюць чужароднымі ў атачэнні плаўных форм бажніцы. У Свята-Ганнінскай царкве вёскі Матыкалы у выніку блізкага размяшчэння барабанаў дадатковых веж, ад цэнтральнай часткі храма, ўтвараюцца снегавыя мяшкі, якія з'яўляюцца прычынай замакання сцяны. З аналагічнай праблемай, але звязанай з невялікім вынасам даху, мы сустракаемся ў Свята-Уладзіміраўскім храме пасёлка Мухавец. Праблема архітэктурнай самадзейнасці часта закранае галіну горадабудаўніцтва, у прыватнасці існуе праблема разнастайнасці архітэктуры будынкаў аднаго духоўнага комплекса. Красамоўна ілюструе гэту з'яву забудова прыходу ў гонар абраза Божай Маці " Усіх Смуткуючых Радасць" у Брэсце.

На вялікі жаль, не атрымаў развіцця ў працах сучасных архітэктаў народны вопыт храмавай архітэктуры, з дапамогай якога можна было б стварыць адмысловыя вобразы праваслаўных цэркваў і ансамбляў з непаўторным каларытам Прыбужжа. Першаўзорам маглі б стаць Свята-Ільінскі храм з вёскі Дубок, Свята-Пакроўская царква з вёскі Покры, Брэсцкага раёну і многія іншыя, ў якіх увасобіўся высокамастацкі густ і прафісіяналізм мясцовых майстроў.

Але ня гледзячы на гэтыя хібы, якія непазбежны пры любым будаўніцтве, пра-васлаўная архітэктура Прыбужжа пакідае ўражанне гарманічнасці і духу вынаходніцтва, без якога немагчыма стварыць арыгінальны архітэктурны вобраз краю.

## ЛІТАРАТУРА


1. Габрусь, Т.В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь.— Мінск: Ураджай, 2001.– 287 с.

2. Глобус Беларуси [Электроны рэсурс] / Архитектурные и иные достопримечательности Беларуси. — Минск, 2008. — Рэжым доступа: http://globus.tut.by/nov_ryasna/index.htm#church. Дата доступа: 20.05.2008.

3. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы Беларусі: Энцыкл. давед / А.М. Кулагін. – Мінск: БелЭн, 2007. – 656 с.

4. Radzima.org – Радзіма майго духу [Электроны рэсурс] / — Менск, 2008. — Рэжым доступа: http://radzima.org/pub/pomnik.php?lang=by&crk=1&nazva_id=brkakami02. Дата доступа: 20.05.2008.


## RESUME


The given work is devoted to studying of the basic directions of development of orthodox architecture Pribuzhski region of the end 20 and the beginnings of 21 centuries. The examples showing continuity of town-planning and volumetric-spatial decisions of modern cult architecture are considered. The special attention is given temples with is central the focused composition in which innovative architectural decisions and approaches are applied. Characteristic regional and national features of modern orthodox temples are revealed. Defects which took place at construction of churches and orthodox complexes are analysed, the recommendations, helping to open are given to feature of modern orthodox architecture Pribuzhski region.